Мікола ВОЛКАЎ

# Беларусь у Вялікай Паўночнай вайне (1700–1721 гг.)*

*Галоўнымі супернікамі падчас Вялікай Паўночнай вайны 1700–1721 гг. былі Швецыя і Расія, якія зацята змагаліся за дамінаванне ў Паўночна-Усходняй Еўропе. Аднак адной з галоўных арэн гэтага жорсткага ваеннага супрацьстаяння сталі беларускія землі, якія зведалі значныя чалавечыя і матэрыяльныя страты. У выніку Паўночная вайна стала адной з найбольш трагічных у гісторыі Беларусі. Заўважым, што ў айчыннай гістарыяграфіі да цяперашняга часу не выпрацавана ўласнага бачання гэтай падзеі і яе наступстваў для беларускіх зямель.*

## Прычыны і пачатак вайны

У другой палове XVII ст. у Балтыйскім рэгіёне дамінавала Шведскае каралеўства. Аднак напрыканцы гэтага стагоддзя склалася сітуацыя, якая падштурхнула суседнія дзяржавы паспрабаваць узяць рэванш за ранейшыя паразы і пашырыць свае тэрыторыі за яго кошт. У 1697 г. памёр шведскі кароль Карл XI, а на каралеўскі пасад узышоў яго сын — пятнаццацігадовы Карл XII. Маладосць новага шведскага караля стварала ілюзію, што Швецыя не здолее адбіць напад з боку кааліцыі моцных дзяржаў рэгіёну. Перадзелу сфер уплыву на Балтыцы найбольш прагнулі Расія, Саксонія і Данія, якія аб'ядналіся ў так званы Паўночны саюз і пачалі рыхтавацца да вайны супраць Швецыі.

Стварэнне антышведскай кааліцыі пачалося з сустрэчы расійскага цара Пятра I з саксонскім курфюрстам Фрыдрыхам Аўгустам I ва ўкраінскім горадзе Раваў у 1698 г. У наступным годзе саюз Расіі і Саксоніі быў аформлены, а неўзабаве да яго далучылася і Данія. Расійскі цар марыў праз захоп Інгрыі і Эстоніі атрымаць выхад да Балтыйскага мора. Гэта дало б яму магчымасць стварыць свой флот на Балтыцы і ўсталяваць непасрэдныя сувязі з краінамі Заходняй Еўропы, што было надзвычай важна для рэфармавання расійскай дзяржавы на еўрапейскі лад, да чаго імкнуўся Пётр I. Такім чынам, перамога над Швецыяй стала справай жыцця маладога расійскага манарха.

Уласныя амбіцыі ў значнай ступені кіравалі і саксонскім курфюрстам Фрыдрыхам Аўгустам I, які ў 1697 г. быў абраны на трон Рэчы Паспалітай пад імем Аўгуста II. Новаабраны кароль польскі і вялікі князь літоўскі выношваў планы па пераўтварэнні Рэчы Паспалітай у абсалютную манархію па ўзоры іншых еўрапейскіх дзяржаў, у тым ліку роднай Саксоніі. Аўгуст II планаваў захапіць у Швецыі Інфлянты, цэнтрам якіх была Рыга, і ператварыць іх у спадчыннае ўладанне. Гэта садзейнічала б умацаванню пазіцый манарха і яго нашчадкаў у Рэчы Паспалітай, паколькі яе пасад у адрозненне ад пасадаў большасці тагачасных еўрапейскіх манархій быў не спадчынным, а выбарным. Аднак палітычныя эліты Польскага Каралеўства і Вялікага Княства Літоўскага не былі зацікаўленыя ў

* Артыкул падрыхтаваны ў рамках працы над выставай "Ultima ratio regum. Беларусь у Паўночных войнах сярэдзіны XVII — пачатку XVIII ст." (Мірскі замак, 21 красавіка — 24 верасня 2017 г.). Аўтар шчыра дзякуе К.Карлюку за дапамогу ў падрыхтоўцы тэксту і падборы ілюстрацый.



*ВОЛКАЎ Мікалай Аляксандравіч.*

*Навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук. Нарадзіўся ў 1985 г. у Мінску. У 2008 г. закончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, у 2016 г. — аспірантуру Інстытута гісторыі НАН Беларусі. У тым жа годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю "Забеспячэнне абароназдольнасці рэзідэнцый роду Радзівілаў на беларускіх землях Вялікага Княства Літоўскага ў XVI — пачатку XVIII ст." (навуковы кіраўнік — доктар гістарычных навук Ю.М.Бохан). Займаецца вывучэннем гісторыі архітэктуры, ваеннай справы і ўзбраення Сярэдніх вякоў і ранняга Новага часу. Аўтар больш за 40 навуковых публікацый, у тым ліку манаграфій "Артылерыя Нясвіжскага замка" (Мн., 2015) і "Слуцк на старых планах" (Мн., 2017).*



pawet.net

новай вайне са Швецыяй, адносіны з якой падчас панавання Яна III Сабескага (папярэдніка Аўгуста II) значна палепшыліся. У выніку Аўгуст II не атрымаў згоды сойма Рэчы Паспалітай на ўцягванне яе ў вайну. Пачатак ваенных дзеянняў супраць Швецыі Саксоніяй быў успрыняты палітычнай элітай дзяржавы як прыватная авантура Аўгуста II як саксонскага курфюрста[1].

Першымі баявыя дзеянні супраць Швецыі распачалі Данія і Саксонія. У лютым 1700 г. саксонскае войска на чале з Аўгустам II уварвалася на тэрыторыю Інфлянтаў і ўзяло ў аблогу Рыгу. Вясной дацкія войскі на чале з каралём Даніі Фрэдэрыкам IV увайшлі на тэрыторыю паўночнанямецкага герцагства Гольштэйн-Гаторп, якое было ў цесным дынастычным і ваенным саюзе са Швецыяй. На стыку лета і восені ў вайну ўступіла і Расія, якая скончыла вайну з Турцыяй, што дазволіла ёй распачаць ваенныя дзеянні супраць Швецыі. Расійскія войскі ўзялі ў аблогу Нарву, буйнейшую фартэцыю рэгіёна.

Аднак рашучыя дзеянні маладога шведскага манарха ў хуткім часе змянілі сітуацыю. Скарыстаўшыся падтрымкай з боку двух наймацнейшых еўрапейскіх марскіх дзяржаў — Англіі і Нідэрландаў, Карл XII спланаваў дзёрзкую аперацыю з мэтай нанесці ўдар у самае сэрца Дацкага Каралеўства. Шведская армія на чале з каралём высадзілася на востраве Зеландыя і ўзяла ў аблогу сталіцу Даніі Капенгаген. У выніку Данія была вымушана пайсці на падпісанне сепаратнага мірнага пагаднення і выйсці з вайны са Швецыяй. Карл XII адзначыў: *"Я вырашыў ніколі не весці несправядлівай вайны, а толькі справядлівую і заканчваць яе згубай непрыяцеля. Я нападу на першага, хто аб'явіць мне вайну, а калі атрымаю над ім перамогу, гэтым, спадзяюся, застрашу іншых"*[2].



Кароль польскі і вялікі князь літоўскі Аўгуст II.



*Шведскі кароль Карл XII.* Партрэт Давіда фон Крафта. 1707 г.

Пасля гэтага Карл XII перакінуў морам свае войска ў Прыбалтыку з мэтай зняць аблогу Нарвы. 30 лістапада 1700 г. шведская армія, у якой налічвалася каля 10 тыс. жаўнераў, разграміла 33-тысячную расійскую армію і зняла аблогу Нарвы[3]. Летам 1701 г. шведы разбілі ўдвая большы саксонска-расійскі корпус у бітве на Дзвіне і знялі аблогу Рыгі. Бліскучыя перамогі засведчылі высокі патэнцыял шведскай арміі, рэфармаванай Карлам XI, а разам з тым і талент военачальніка маладога Карла XII. У выніку спадзяванні саюзнікаў на хуткую перамогу над Швецыяй развеяліся, а вайна набыла зацяжны характар і прынесла значныя страты для краін рэгіёну.

Першыя перамогі дазволілі Швецыі абараніць свае ўладанні, і перад Карлам XII паўстала пытанне аб далейшай стратэгіі вайны. Некаторыя яго дарадцы лічылі яе мэты дасягнутымі і прапаноўвалі ма-

нарху скончыць ваенныя дзеянні ды вярнуцца ў Швецыю. Разглядаўся таксама варыянт паходу на Маскву з мэтай канчатковага разгрому Пятра І. Аднак, улічваючы складанасць прасоўвання па слабазаселеных паўночных рэгіёнах Расіі, ажыццявіць гэты план без папярэдняй падрыхтоўкі было цяжка. Больш слушным шведскае камандаванне палічыла інтэрвенцыю ў Рэч Паспалітую, з мэтай звяржэння Аўгуста II і ператварэння Рэчы Паспалітай у саюзніка Швецыі, што дазволіла б шведскай арміі выкарыстаць яе значныя рэсурсы для вайны з Расіяй.

Прынцыповае значэнне тут мела пазіцыя самога Карла XII. Шведскі кароль прагнуў асабіста разбіць Аўгуста II, да якога ставіўся з вялікай непрыязню. Даследчыкі мяркуюць, што, пачынаючы з часу ўварвання ў Рэч Паспалітую, шведская стратэгія вайны вызначалася фактычна ўласна маладым каралём, якім часта кіравалі асабістыя матывы. Карл XII не жадаў заключаць мір з праціўнікам да яго поўнага паражэння. Ваенныя паходы былі тым, чаго насамрэч жадаў кароль[4]. Супярэчыць яго волі ва ўмовах склаўшайся ў Швецыі абсалютысцкай палітычнай мадэлі дарадцы не маглі. У такіх умовах палявая канцылярыя караля фактычна не толькі вызначала стратэгію ваенных дзеянняў, але і кіравала ўсёй дзяржавай. Абсалютную ўладу ў войску і ў дзяржаве меў і расійскі цар Пётр I, які таксама актыўна ўдзельнічаў у ваенных кампаніях. Таму гэтая вайна набыла характар супрацьстаяння двух амбітных манархаў, якія асабіста ўплывалі на ход ваенных дзеянняў.




*Расійскі цар Пётр I.* Гравюра Пітэра ван дэн Берге паводле карціны Готфрыда Кнелера. 1698 г.

## Уцягванне ў вайну Рэчы Паспалітай

Напярэдадні Вялікай Паўночнай вайны ў Вялікім Княстве Літоўскім склалася вельмі спецыфічная ўнутрыпалітычная сітуацыя. Яшчэ ў 1680-я гг. небывалага ўплыву ў Княстве дасягнуў род Сапегаў на чале з вялікім гетманам Казімірам Янам і вялікім падскарбіем Бенядзіктам. Маючы ў сваіх руках кантроль над войскам і скарбам, яны фактычна адчувалі сябе гаспадарамі ў краіне, што выклікала незадавальненне іншых магнацкіх груповак. Праціўнікі Сапегаў выступалі ў абарону "залатых шляхецкіх вольнасцяў", таму іх называлі рэспубліканцамі. Найбольш аўтарытэтнымі лідарамі рэспубліканцаў былі Рыгор Антоні Агінскі, Міхал Серваццы Вішнявецкі і Караль Станіслаў Радзівіл. У канцы XVII ст. супрацьстаянне паміж Сапегамі і рэспубліканцамі перарасло ва ўзброены канфлікт. Вырашальнай ваеннай сутычкай стала бітва пад Алькенікамі 18 лістапада 1700 г., у якой Сапегі пацярпелі паражэнне.

Паколькі паход саксонскіх войскаў на Рыгу ў 1700 г. адбыўся з тэрыторыі Рэчы Паспалітай, Карл XII лічыў, што мае поўнае права ўступіць на яе тэрыторыю. Ён збіраўся звергнуць Аўгуста II, прывесці да ўлады прыхільнага да Швецыі манарха і ўцягнуць Рэч Паспалітую ў вайну з Расіяй. Для рэалізацыі гэтых планаў шведы пачалі пошук прыхільнікаў сярод палітычнай эліты краіны. Першымі на іх бок перайшлі Сапегі, якія імкнуліся аднавіць свае пазіцыі ў ВКЛ. Іх праціўнікі рэспубліканцы згуртаваліся вакол Аўгуста II і разлічвалі на ваенную дапамогу Расіі. У выніку для Рэчы Паспалітай гэтая вайна набыла характар грамадзянскай, а галоўныя праціўнікі, што змагаліся на яе тэрыторыі — Швецыя, Расія і Саксонія, наўпрост выкарыстоўвалі рэсурсы краіны для дасягнення сваіх ваенна-палітычных мэт.

У лютым 1702 г. 7-тысячная шведская армія ўвайшла ў межы Рэчы Паспалітай з тэрыторыі Інфлянтаў. У красавіку яе галоўны корпус на чале з Карлам XII спыніўся ў Гародні, а ў траўні адышоў у накірунку Варшавы. Паралельна з ім рухаўся корпус пад кіраўніцтвам генерал-маёра Карла Густава Мёрнера, які заняў Вільню і праз Ашмянскі і Навагрудскі паветы ў чэрвені выйшаў да Берасця[5]. Неўзабаве ён рушыў на польскія землі. На насельніцтва рэгіёнаў, што знаходзіліся на шляху шведскага войска, накладвалася кантрыбуцыя. Улічваючы высокую баяздольнасць шведскай арміі, рэспубліканцы не наважваліся выступаць супраць шведаў у адкрытым полі. У гэтых умовах баявыя дзеянні набылі характар партызанскай вайны: атрады рэспубліканцаў перашкаджалі шведам нарыхтоўваць прыпасы і фураж, а таксама знішчалі іх невялікія аддзелы[6]. У тым жа, 1702 г. на заклік рэспубліканцаў у межы ВКЛ увайшлі казацкія аддзелы гетмана Івана Мазепы, якія падпарадкоў-

ваўся Пятру I. Яны разагналі прыхільнікаў Сапегаў у Падняпроўі і дапамаглі рэспубліканцам авалодаць моцнай фартэцыяй Сапегаў у Быхаве.

Заняцце Варшавы і перамога над польска-саксонскім войскам у бітве пад Клішавам у ліпені 1702 г. не дапамаглі Карлу XII атрымаць кантроль над Рэччу Паспалітай. Хаця пазіцыі Аўгуста II у краіне на пачатку вайны былі хісткія, колькасць яго прыхільнікаў пачала расці, калі сталі адчувацца наступствы дзеянняў шведскай арміі на тэрыторыі Рэчы Паспалітай. У 1702 г. прыхільнікі Аўгуста II утварылі Сандамірскую канфедэрацыю і выказаліся за працяг змагання са шведамі. На працягу 1703—1704 гг. Карл XII "кружыў" па тэрыторыі Польшчы, атрымліваючы адну за адной перамогі над саксонцамі і іх польскімі саюзнікамі. Пры гэтым шведы занялі ключавыя гарады Польскага Каралеўства: Варшаву, Кракаў, Торунь, Львоў, Эльблёнг і Познань. Аднак фактычна армія Карла XII "угразла" ў Рэчы Паспалітай, бо ўзяць пад поўны кантроль яе тэрыторыю ніяк не ўдавалася. Вайсковыя аддзелы прыхільнікаў Аўгуста II увесь час ухіляліся ад адкрытай бітвы са шведамі і вялі супраць іх партызанскую вайну. А ў Карла XII не хапала войскаў, каб кантраляваць значныя абшары Рэчы Паспалітай. Не асабліва дапамагло шведам і скліканне ў Варшаве ў 1704 г. канфедэрацыі, якая абвясціла аб дэтранізацыі Аўгуста II і абрала каралём польскім і вялікім князем літоўскім Станіслава Ляшчынскага. У 1705 г. апошні быў каранаваны, аднак не займеў шырокай падтрымкі ўнутры краіны, а яго ўлада трымалася на шведскай зброі.

Пакуль Карл XII "ганяўся" па Рэчы Паспалітай за Аўгустам II, Пётр I атрымаў час для рэарганізацыі сваёй арміі. Разгром пад Нарвай прадэманстраваў недахопы расійскага войска, якое малады і энергічны цар цалкам перабудаваў на шведскі ўзор. Баявое хрышчэнне новаарганізаваныя палкі Пятра I атрымалі падчас паходу ў шведскую Інгрыю і Карэлію, дзе ў 1702 г. Расія актывізавала баявыя дзеянні. Карыстаючыся адсутнасцю ўвагі Карла XII да гэтага тэатру ваенных дзеянняў і маючы колькасную перавагу, расійскія войскі да 1704 г. змаглі захапіць ключавыя фартэцыі ў гэтым рэгіёне: Нарву, Нотэбург і Ніеншанц. А ў 1703 г. Пётр I заснаваў на месцы шведскага горада Ніена Санкт-Пецярбург, які стаў новай сталіцай Расіі, і пачаў будаўніцтва флоту на Балтыйскім моры.

Пасля перамог у Прыбалтыцы расійскі цар вырашыў аказаць дапамогу свайму саюзніку Аўгусту II. Абранне ў 1704 г. Станіслава Ляшчынскага каралём і вялікім князем прымусіла прыхільнікаў саксонскага курфюрста выступіць за больш цеснае супрацоўніцтва з Расіяй. 30 жніўня 1704 г. Пётр I падпісаў з Аўгустам II дамову аб сумесных наступальных і абарончых дзеяннях. Згодна з ёй расійскі цар абавязваўся ўвесці на тэрыторыю Рэчы Паспалітай 12-тысячную армію, якая павінна была ўтрымлівацца за кошт мясцовага насельніцтва[7]. Такім чынам, Расія атрымала права весці ваенныя дзеянні на землях Рэчы Паспалітай і накладаць на яе жыхароў кантрыбуцыі на патрэбы сваёй арміі.

## Баявыя дзеянні ў Беларусі ў 1705—1706 гг.

Вясной 1705 г. Пётр I увёў на беларускія землі значную вайсковую групоўку. Ён збіраўся разгарнуць актыўныя баявыя дзеянні супраць шведаў на тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Першапачаткова расійская групоўка была сканцэнтраваная ў Полацку, але ключавым пунктам ваеннай стратэгіі Пятра I у 1705 г. стала Гародня, у якой восенню знаходзілася магутная расійская вайсковая групоўка пад камандаваннем генерал-фельдмаршал-лейтэнанта Георга Бенядзікта Агільві. Яна налічвала 24—26 тыс. жаўнераў і мела 103 гарматы. Гэта дазволіла перакрыць сувязь арміі Карла XII, што знаходзілася ў Польшчы, са шведскімі Інфлянтамі і пры неабходнасці давала магчымасць разгарнуць супраць яе наступальную аперацыю, у якой павінны былі прыняць удзел саксонская армія і сілы Сандамірскай канфедэрацыі.

Тым часам шведскі кароль вырашыў апярэдзіць саюзнікаў і разграміць армію Г.Б.Агільві. Зімой 1706 г. Карл XII са сваёй арміяй у 20 тыс. жаўнераў хуткім маршам рушыў у бок Гародні, да якой падышоў 25 студзеня. Улічваючы колькасную перавагу праціўніка і стомленасць уласнай арміі імклівым пераходам, шведскі кароль не стаў штурмаваць горад, а раскінуў свае сілы на зімовыя кватэры на ўсход ад яго. У лютым 1706 г. шведскія войскі на чале з генералам Карлам Густавам Рэншэльдам разграмілі пад Фраўштатам злучаны саксонска-расійскі корпус, у выніку чаго спадзяванні Пятра I на дапамогу саксонскіх войскаў арміі Г.Б.Агільві развеяліся.

На дапамогу заблакаванай у Гародні арміі Пётр I паслаў 12 тыс. казакоў Івана Мазепы, якія занялі Менск, Слуцк, Нясвіж і Ляхавічы. Для супрацьстаяння ім шведы накіравалі шэраг моцных аддзелаў. Мэтай апошніх было таксама здабыванне правіянту для арміі і рабаванне маёнткаў праціўнікаў Станіслава Ляшчынскага. Такі падыход у час вайны лічыўся вельмі дзейсным для аслаблення палітычных апанентаў. Адзначым, што адным з галоўных прыхільнікаў Аўгуста II у ВКЛ быў тагачасны нясвіжскі ардынат канцлер ВКЛ Караль Станіслаў Радзівіл, таму яго маёнткі чакаў незайздросны лёс. У сярэдзіне сакавіка 1706 г. у накірунку Нясвіжа быў высланы атрад на чале з падпалкоўнікам Ёганам Рэйнгальдам фон Траўтфетэрам. Ён павінен быў выбіць 1,5—2 тыс. казакоў на чале са старадубскім палкоўнікам Міхайлам Міклашэўскім, якія занялі радзівілаўскую сталіцу. На шляху да Нясвіжа шведы разбілі атрад казакоў у Міры і 23 сакавіка былі ўжо на месцы. Раніцай наступнага дня шведы знянацку напалі і разграмілі казакоў. Падчас бою Нясвіж быў часткова спалены. Наступнай мэтай атрада Ё.Р.Траўтфетэра сталі Ляхавічы, да якіх шведы падышлі 25 сакавіка. Казакі, даведаўшыся аб набліжэнні непрыяцеля, закрыліся ў магутным Ляхавіцкім замку, таму шведам давялося адступіць.

Аблога замка ў Ляхавічах пачалася ў сярэдзіне красавіка. Карл XII выслаў сюды значныя сілы на чале з палкоўнікам Карлам Густавам Крэйцам. Аднačасова шведы выправілі дробныя атрады для раба-



*Нясвіжскі ардынат і канцлер ВКЛ Караль Станіслаў Радзівіл.* Партрэт канца XVII — пачатку XVIII ст.

вання ваколіц Ляхавічаў і Нясвіжа. Як пісаў тагачасны нясвіжскі адміністратар Ежы Вінцэнты Таўрыловіч, "*вораг абкружыў Нясвіж з усіх бакоў*". 23 красавіка шведы ўвайшлі ў Нясвіж і сталі патрабаваць ад мясцовага адміністратара і мяшчан, якія закрыліся ў замку, каб тыя выдалі кантрыбуцыю на карысць шведскага войска. Не атрымаўшы яе, яны пачалі рабаваць горад. Пасля гэтага былі спустошаныя фальваркі вакол Нясвіжа, у тым ліку летняя рэзідэнцыя Радзівілаў у Альбе. З мяшчан і шляхты, якіх знаходзілі ў горадзе ці ваколіцах, патрабавалі грошы, некаторых бралі ў закладнікі. 26 красавіка шведы цалкам спалілі радзівілаўскае мястэчка Свержань. Адзначым, што некранутымі тут засталіся драўляныя склады, якія належалі тагачаснаму ўласніку Слуцка — прадстаўніку нямецкага княжацкага роду Карлу Філіпу Нойбургу. Гэты факт сведчыць пра мэтанакіраванае разбурэнне маёнткаў К.С.Радзівіла, што павінна было прымусіць магната да пакорлівасці. 27 красавіка шведы ўвайшлі ў Мір. Мястэчку ўдалося адкупіцца, але мясцовы замак быў на наступны дзень спалены[8].

Тым часам Г.Б.Агільві атрымаў ад Пятра І загад вывесці войскі з Гародні і адарвацца ад шведаў, пазбягаючы адкрытай бітвы. 9 красавіка, калі на Нёмане рушыў лёд, расійскія войскі пераправіліся праз раку і накіраваліся да Берасця, каб адтуль перайсці на Валынь. Для хуткага руху ўсе цяжкія гарматы былі затопленыя ў рацэ, а параненыя пакінутыя ў Тыкоціне. Імклівы адыход расійскай арміі стаў нечаканасцю для Карла XII, войскі якога здолелі пераправіцца праз Нёман толькі 14 красавіка. Вясенняя адліга зрабіла пагоню за арміяй Г.Б.Агільві беспаспяховай. 28 красавіка шведы дасягнулі Бярозы, дзе разбілі расійскі аддзел, што прыкрываў пераправу праз Ясельду. Далей уздоўж паўднёвага берагу Ясельды шведы дайшлі да Пінска, у які ўвайшлі 4 мая. На гэтым шляху была блакаваная фартэцыя Жабер, што належала Вішнявецкім, з гарнізонам у 815 чалавек і артылерыяй у 58 гармат[9]. У хуткім часе яна капітулявала і была па загадзе Карла XII зруйнаваная. У Пінску шведскага караля чакала расчараванне: пабачыўшы вясновую паводку на Прыпяці, ён зразумеў, што пераправіцца і дагнаць Г.Б.Агільві ён не зможа.

У канцы красавіка на дапамогу Ляхавіцкай фартэцыі з Менску рушыў аддзел расійскага войска на чале з ваяводам Сямёнам Няплюевым, да якога далучыліся і казакі са Слуцка. Агульная колькасць гэтага атрада дасягала 5 тыс. К.Г.Крэйц, які трымаў у аблозе Ляхавічы, меў інфармацыю аб набліжэнні ворага і вырашыў яго апярэдзіць. 30 красавіка шведы атакавалі расійска-казацкае войска пад Клецкам і ўшчэнт разбілі яго. Маючы колькасна меншыя сілы, яны скарысталіся сваёй улюбёнай тактыкай: напалі раптоўна ранкам. Пасля вяртання К.Г.Крэйца пад Ляхавічы і дэманстрацыі захопленых ім пад Клецкам трафеяў абаронцы замка ў колькасці 1361 чалавека здаліся. Даведаўшыся аб перамозе пад Клецкам, Карл XII 12 мая разам з эскортам у 50 чалавек рушыў з Пінска ў Ляхавічы. Ён загадаў разбурыць умацаванні фартэцыі, пры гэтым палац быў пакінуты некранутым, паколькі ён належаў саюзнікам шведаў Сапегам.

З Ляхавічаў Карл XII з атрадам К.Г.Крэйца рушыў на Нясвіж. 20 мая а другой гадзіне дня шведы падыйшлі да Нясвіжскага замка. Кароль аб'ехаў фартэцыю і накіраваў парламенцёра з патрабаваннем капітуляцыі. У выпадку, калі фартэцыя не капітулюе і будзе здабытая штурмам, Карл XII пагражаў забіць усіх абаронцаў, а замак, горад і кляштары спаліць. У выніку фартэцыя здалася. Аднак генеральнай бітвы і знішчэння галоўнай арміі непрыяцеля, чаго так прагнуў Карл XII, не адбылося, паход фактычна скончыўся безвынікова, а вайна зацягвалася.

22 мая Карл XII пакінуў Нясвіж і накіраваўся ў Слуцк. Мясцовы гарнізон колькасцю 500 чалавек, які падпарадкоўваўся Карлу Філіпу Нойбургу, не аказаў шведам супраціўлення. Кароль загадаў расплавіць лёгкія гарматы, каб імі не маглі скарыстацца расійскія войскі, і на наступны дзень накіраваўся ў Пінск. 2 чэрвеня, дачакаўшыся падзення ўзроўню вады ў Прыпяці, шведы рушылі на Валынь за расійскім войскам[10].

Неўзабаве Карл XII вырашыў спыніць пагоню і павярнуў на захад, каб нанесці ўдар па Саксоніі і канчаткова вывесці з вайны Аўгуста II. У выніку ўварвання шведскай арміі ў яго спадчыннае герцагства саксонскі курфюрст быў вымушаны ўрэшце пайсці на мір. Паводле дамовы, заключанай паміж Саксоніяй і Швецыяй у верасні 1706 г. у Альтранштаце, Аўгуст II адмовіўся ад кароны Рэчы Паспалітай і выйшаў з саюзаў супраць Швецыі. Разам з тым ён абавязаўся выплаціць велізарную грашовую кантрыбуцыю Карлу XII.

## Баявыя дзеянні ў Беларусі у 1708 г.

У Саксоніі шведы прастаялі даволі доўга — да восені 1707 г. Час і грошы, атрыманыя ад Аўгуста II, Карл XII пусціў на ўпарадкаванне і павелічэнне сваёй арміі. Урэшце ён палічыў, што Швецыя падрыхтаваная да кампаніі супраць Расіі, і накіраваў свае войскі на ўсход. Дарадцы прапаноўвалі яму найперш сканцэнтраваць асноўныя сілы ў Прыбалтыцы, каб вярнуць землі, захопленыя расійскімі войскамі. Аднак Карл XII прагнуў наступлення на Маскву. У гэтым вельмі добра праглядаецца суб'ектыўны ірацыянальны матыў, якім часта кіраваўся шведскі кароль пры планаванні ваенных аперацый[11].

Пасля заняцця шведамі Саксоніі і абвяшчэння Альтранштацкага міру Пётр I разумеў, што наступны ўдар будзе нанесены па Расіі. Расійскія дыпламаты пачалі рабіць захады, каб праз вяртанне занятых шведскіх тэрыторый у Прыбалтыцы дасягнуць замірэння. Для Пятра I важным было толькі захаваць у сваіх руках Санкт-Пецярбург, аднак Карл XII па-ранейшаму прагнуў генеральнай бітвы і поўнага разгрому расійскіх войскаў, каб яго перамога была абсалютнай.

У такіх умовах расійскае вайсковае камандаванне пачало распрацоўваць план абароны ад шведаў. У красавіку 1707 г. у Жоўкве на Украіне адбылася яго нарада на чале з Пятром I. На ёй быў выпрацаваны так званы Жоўкаўскі план, у якім сфармуляваныя асноўныя прынцыпы вядзення будучай ваеннай кампаніі, што мусіла мець цалкам абарончы характар. Пры гэтым расійскае камандаванне лічыла небяспечным правядзенне генеральнай бітвы на тэрыторыі Рэчы Паспалітай, паколькі ў выпадку няўдачы ўскладнялася магчымасць адступлення і рэарганізацыі арміі. Сваю ролю адыграў і недавер да сваіх саюзнікаў у Рэчы Паспалітай, і невысокі баявы патэнцыял войскаў Сандамірскай канфедэрацыі. Лініяй абароны супраць шведаў павінен быў стаць Дняпра. Тэрыторыю Рэчы Паспалітай Пётр I планаваў выкарыстаць у якасці буфернай зоны для знясільвання арміі Карла XII. На шляху шведаў меркавалася забіраць ці знішчыць усе наяўныя ў насельніцтва харчовыя прыпасы і фураж, а шведскую армію пастаянна турбаваць невялікімі нападамі, не ўступаючы ў генеральную бітву[12]. Такім чынам, беларускія землі, праз якія пралягала дарога на Маскву, мусілі быць прынесены ў ахвяру дзеля перамогі над шведамі.

У лістападзе 1707 г. Карл XII з 34-тысячнай арміяй падышоў да Віслы. Ужо на польскіх землях шведы адчулі праблемы з забеспячэннем, паколькі яшчэ летам расійскія войскі метадычна збіралі тут прыпасы і фураж[13]. Шведскія войскі праводзілі жорсткія рэквізіцыі ў мясцовага насельніцтва, імкнучыся "кампенсаваць" недахопы ў сваім забеспячэнні. У канцы студзеня 1708 г. Карл XII выйшаў да Гародні, якую незадоўга да гэтага пакінуў Пётр I. Чакаючы падыходу ўсіх аддзелаў сваёй арміі, шведскі кароль некаторы час прастаяў у разрабаваным і напаўспустошаным горадзе. Неўзабаве шведы рушылі далей на ўсход. Але з-за лютых маразоў, дайшоўшы да Смаргоні, шведская армія ўрэшце была вымушаная спыніцца і стаць на зімовыя кватэры.

Карыстаючыся заняпадам палітычнай улады ў ВКЛ, Пётр I адчуваў тут сябе поўным гаспадаром. Таму нішто не магло стрымаць расійскія войскі, якія пры адступленні праводзілі татальныя рэквізіцыі на беларускіх землях. У адным з загадаў Пятра I адзначалася: *"Хлеб стоячий на поле и в гумнах жечь, не жалея, убранный вывозить, при невозможности прятать, мельницы и жернова закопать в землю, дабы хлеб молоть нечем было, строения и мосты портить, леса зарубать. А ежели кто повезет к неприятелю, хоть и за деньги, будет повешен"*[14].

Асаблівая ўвага надавалася маёнткам прыхільнікаў шведаў. Яны падлягалі грунтоўнаму спусташэнню. А паколькі да часу наступлення Карла XII ужо значная частка палітычнай эліты ВКЛ перайшла на шведскі бок, такі лёс чакаў многія маёнткі. Варожымі, напрыклад, лічыліся Мір і Нясвіж К.С.Радзівіла, які ўжо прысягнуў на вернасць Станіславу Ляшчынскаму. Расійскія аддзелы масава вывозілі з беларускіх фартэцый узбраенне. Так, імі былі цалкам спустошаныя арсеналы Быхава, Глуска, Слуцка і Магілёва.

Вясна і лета 1708 г. выдаліся дажджлівыя, што не спрыяла правядзенню ваенных аперацый. Тым не менш 5 чэрвеня армія Карла XII знялася з зімовых кватэр і рушыла ў наступ у кірунку Смаленска. Тады ж шведскаму генералу Адаму Людвігу Левенгаўпту, які са значнымі вайсковымі сіламі стаяў у Рызе, быў аддадзены загад рухацца на злучэнне з каралём, каб умацаваць яго армію. Расійскія ж войскі стаялі ўздоўж Дняпра ў раёне Оршы, Шклова і Магілёва. Пётр I здолеў сканцэнтраваць "на беларускім напрамку" больш за 70 тыс. жаўнераў рэгулярнага войска і 10 тыс. казакоў і калмыкаў. Нягледзячы на больш чым двухразовую колькасную перавагу праціўніка, Карл XII здолеў смелым ударам узламаць расійскую абарону на Дняпры. 14 ліпеня ў бітве пад Галоўчынам 12-тысячны корпус Карла XII перамог і прымусіў адступіць 38-тысячнае злучэнне расійскіх войскаў[15].

7 ліпеня шведская армія заняла Магілёў. Лёс гэтага беларускага горада падчас Паўночнай вайны паказальны. З пачаткам вайны значна ўзрос падатковы цяжар на яго жыхароў. Яны вымушаныя былі збіраць і кантрыбуцыю на карысць вайсковых частак, што праходзілі праз яго. Асабліва цяжкім быў 1707 г., калі ў рэгіёне былі сканцэнтраваныя значныя расійскія вайсковыя сілы. У самім Магілёве вясной спыняўся Аляксандр Меншыкаў, які не хаваў намеру спаліць горад пры набліжэнні шведаў. Аднак праз дарагія падарункі і выплату вялікай кантрыбуцыі на карысць расійскіх войскаў гараджанам удалося яго залагодзіць. Шведы заставаліся ў Магілёве больш за месяц у чаканні падыходу з Інфлянтаў корпусу А.Л.Левенгаўпта. Магілёў быў буйнейшым гаспадарчым цэнтрам Падняпроўя, таму побыт у ім дазволіў шведскаму войску на некаторы час забяспечваць свае патрэбы. Пры гэтым з мяшчан выцягвалася ўсё, што не выбралі папярэднікі.

У жніўні, не дачакаўшыся падыходу падмогі, Карл XII рушыў у бок Мсціслава, прагнучы генеральнай бітвы з арміяй Пятра І. Але расійскія войскі і надалей працягвалі ўхіляцца ад яе. Таму шведскае камандаванне разглядала варыянт вяртання ў Магілёў, каб там дачакацца корпуса Левенгаўпта. З мэтай не дапусціць гэтага, расіяне прынялі рашэнне спустошыць рэгіён цалкам. 8 верасня Магілёў абкружылі расійскія аддзелы, якія далі жыхарам гадзіну на тое, каб пакінуць горад. Пасля гэтага было разрабавана тое, што мяшчане не змаглі вывезці ці схаваць, і ўрэшце горад запалілі. За некалькі дзён да гэтага такім жа чынам былі спаленыя Дуброўна і Орша, а крыху пазней Горкі[16].

Землі, па якіх ішлі шведы, былі цалкам спустошаныя, што прывяло да праблем з забеспячэннем іх арміі. Таму пасля шэрагу сутычак з расійскімі войскамі, якія занялі абарончыя пазіцыі на мяжы ВКЛ і Расіі і працягвалі ўхіляцца ад буйнамаштабнай бітвы, Карл XII прыняў рашэнне рухацца на ўкраінскія землі. Там з дапамогай новага саюзніка, гетмана Івана Мазепы, Карл XII спадзяваўся паправіць становішча сваёй арміі. Аднак, не дачакаўшыся падыходу дапамогі, ён зрабіў памылку, якая паўплывала на лёс усёй кампаніі.

Даведаўшыся аб тым, што армія Карла XII і корпус А.Л.Левенгаўпта працягвалі дзейнічаць асобна, Пётр І вырашыў разбіць апошні. 9 кастрычніка корпус расійскіх войскаў на чале з самім царом нагнаў А.Л.Левенгаўпта каля вёскі Лясная. Сілы бакоў былі прыкладна роўныя: шведскі корпус налічваў 12 950 чалавек, расійскі — 13 841. Расійскія войскі не марудзячы перайшлі ў наступ і прымусілі шведаў заняць абарону. Урэшце А.Л.Левенгаўпт быў вымушаны адступіць са значнымі стратамі, кінуўшы ўвесь абоз. У выніку да Карла XII дайшлі толькі 6 тыс. знясіленых у бітве жаўнераў з падарваным баявым духам, а абоз з харчаваннем і амуніцыяй, на які так разлічваў кароль, быў страчаны цалкам[17]. Бітва пад Лясной выразна паказала, што баявыя якасці расійскай арміі значна выраслі. Фактычна яна пераняла і паспяхова выкарыстала шведскую тактыку вядзення бою[18].

Стратэгія знясільвання арміі Карла XII, якая рэалізоўвалася Пятром І на беларускіх землях у 1707—1708 гг., аказалася вельмі эфектыўнай. Баявы дух шведскіх жаўнераў, змучаных доўгай пагоняй за непрыяцелем, знізіўся. Адпачынку і дастатковых прыпасаў шведы на Украіне не знайшлі і былі вымушаныя перажыць цяжкую зіму ў паходных умовах. У выніку вясной 1709 г. у арміі Карла XII засталося ўсяго 23 тыс. жаўнераў. Неўзабаве яна трапіла ў стратэгічнае акружэнне і была разбітая пад Палтавай.

Пасля разгрому Карла XII на Украіне сітуацыя ў Рэчы Паспалітай цалкам змянілася. Да ўлады вярнуўся Аўгуст II, а ўся палітычная эліта дэкларавала лаяльнасць расійскаму цару. Пры гэтым войскі Пятра І не спяшаліся пакідаць тэрыторыю Рэчы Паспалітай і, у прыватнасці, беларускія землі. Пётр І у выніку абкружэння расійскай арміі турэцкай ля ракі Прут у Малдавіі ў 1711 г. быў вымушаны пагадзіцца на вывад сваіх войскаў з Рэчы Паспалітай. Аднак гэтую ўмову ён не выканаў.

У 1715 г. частка магнатаў і шляхты, незадаволеныя спробамі Аўгуста II узмацніць каралеўскую ўладу, утварылі Тарнагродскую канфедэрацыю. Неўзабаве яны звярнуліся з просьбай аб дапамозе да Пятра І. Пад ціскам расійскіх войскаў Аўгуст II быў вымушаны пайсці на саступкі. А ў 1717 г. адбыўся т. зв. "Нямы сойм", які прайшоў пад дыктоўку Расіі. Адной з яго пастановаў было абмежаванне колькаснага складу арміі Рэчы Паспалітай да 24 тыс. порцый[19], толькі чвэрць з якіх забяспечвалася са скарбу ВКЛ[20]. У рэальнасці, улічваючы спецыфіку ўсёй сістэмы і маніпуляцыю з т. зв. "сляпымі порцыямі", гэта давала магчымасць утрымліваць менш за 16 тыс. жаўнераў[21]. Гэтае малое войска абсалютна не адпавядала патрэбам такой вялікай дзяржавы, як Рэч Паспалітая, і рабіла яе цалкам безабароннай у геапалітычных гульнях магутных суседзяў.

### Мірскае графства ў полымі вайны

Наступствы падзей Вялікай Паўночнай вайны праявіліся вельмі хутка. Адным з галоўных яе вынікаў стала спусташэнне беларускіх зямель і значны дэмаграфічны крызіс. Каб паспрабаваць зразумець стратэгіі паводзінаў мірнага насельніцтва, якому даводзілася працяглы час жыць ва ўмовах ваеннай штодзённасці, варта засяродзіць увагу на асобным мікрарэгіёне. Вельмі зручным аб'ектам для гэтага з'яўляецца Мірскае графства, на матэрыялах якога выразна бачны характар Вялікай Паўночнай вайны.

Нагадаем, што буйная зямельная латыфундыя з цэнтрам у Міры была створана намаганнямі Юрыя Ілініча ў канцы XV — пачатку XVI ст.[22]. У далейшым яна была пераўтвораная ў графства і перайшла ва ўладанне роду Радзівілаў, якім належала да пачатку XIX ст. Межы Мірскага графства на працягу ўсяго часу яго існавання не былі пастаяннымі. У сярэдзіне — другой палове XVII ст. у яго ўваходзілі мястэчкі Мір і Свержань, а таксама фальваркі Мір, ці Замір'е (вёскі Любна, Вялікае Сяло, Залужжа, Залоззе, Ператокі, Сімакава, Беражна і Агароднікі), Тулонка (вёскі Тулонка, Аталезь, Сяменчыцы і Жукаў Барок) і Пясэчнае (вёскі Пясэчнае і Радунь). У канцы XVII ст. да графства быў далучаны Аюцавіцкі фальварак з вёскамі Аюцавічы і Слабодка. Тагачасныя гаспадарчыя дакументы дазваляюць рэканструяваць дэмаграфічную сітуацыю ў графстве ў канцы XVII — пачатку XVIII ст.[23]. Вельмі цікавымі крыніцамі з'яўляюцца таксама лісты радзівілаўскіхураднікаў, якія працягвалі кіраваць маёнткамі ў час вайны. У іх яны пакінулі шмат цікавых звестак аб падзеях таго часу[24]. Пэўны суб'ектывізм карэспандэнцыі толькі дапамагае лепш зразумець праблемы, якія насамрэч хвалявалі людзей, як яны самі ацэньвалі складаўшуюся сітуацыю. З дапамогай гэтых лістоў мы маем магчымасць пабачыць падзеі часоў Вялікай Паўночнай вайны ў Мірскім графстве вачыма іх сведак.

У пачатку XVIII ст. насельніцтва Мірскага графства дасягнула 9 тыс. чалавек, з якіх 3,6 тыс. жылі ў Міры. Цудоўнае апісанне квітнеючага мястэчка пакінуў П.Талстой, які ў красавіку 1697 г. па дарозе ў Італію завітаў у Мір: *"Город Мир — маетность князя Радивила... подканцлера литовскаго. Тот город земляной, в нем есть церковь униятцкая да костел римской каменные, служат попы белые. В тот город четверы ворота проезжие каменные; в том городе домы мещанские богатые и жидов много. Место не велико, а домов изряднаго строения много..."*[25].

Подых вайны жыхары Мірскага графства адчулі ў 1698 г., калі праз яго тэрыторыю пачалі праходзіць войскі: спачатку саксонская армія Аўгуста II, а пасля харугвы ВКЛ. Так ці інакш людзям даводзілася адкупацца ад пастояў жаўнераў. Вайна для жыхароў Мірскага графства пачалася ў траўні — чэрвені 1702 г., калі ў Навагрдскае ваяводства ўвайшло шведскае войска. Уначы шведы *"як непрыяцелі"* нечакана ўварваліся ў Мір і пабралі ў закладнікі багацейшых мяшчан, у тым ліку адміністратара графства Яна Крыер-Ваеўскага. Іх завялі ў вайсковы лагер і запатрабавалі выдаць гадавы прыбытак з мястэчка і графства. Дамаўляцца са шведамі паехаў Міхал Лышкевіч, які ў сваім лісце апісаў пабачанае: *"Двойчы адмыслова ездзіў у шведскі абоз у Асташын і Палужжа дзеля аховы вёсак... Пабачыў даволі: як праводзілі з нягневіцкага двара і воласці сена, рознае збожжа, таксама з Карэлічаў і фальваркаў тых маёнткаў, што было забрана... Не было ніводнага чалавека ў Нягневічах і ў Карэлічах. Вокны, дзверы павыбіваныя, рознае начынне на падворку паразбіванае, толькі некаторыя вокны ў вялікім будынку цэлыя засталіся... Вялікую колькасць рознага быдла адусюль да абозу прыведзена. У Карэлічах у двары шмат шкоды нарабілі... Хацеў наведаць мяшчан у шведскім абозе, але пабаяўся, каб не трапіць у іх кампанію. Дамовіліся са шведскім генералам, каб даць з Міра 5000 бітых талераў, 100 бочак мукі, 100 бочак аўса, 100 вазоў сена, 30 полцаў саланіны, 5 бочак мёду, 2 кусы гарэлкі, масла і сыроў. У Міры, што было дворных, шляхецкіх і сялянскіх коней узята 200... Мусіў саступіць так шмат для аховы падданых. Учарашняе ночы меў быць атрад у Мір, але не было. Спадзяемся, вартуючы на іх кожную ноч, каб не напалі ўначы..."*[26].

Як бачна, нават пасля выплаты кантрыбуцыі мяшчане не пачуваліся ў бяспецы. На працягу некалькіх наступных гадоў з насельніцтва графства шматразова выбіралі сродкі розныя харугвы войска ВКЛ, а з 1705 г., у адпаведнасці з дамоўленасцю Аўгуста II з Пятром I, у дадатак да гэтага пачалі збіраць спецыяльны падатак на ўтрыманне расійскага войска на землях ВКЛ. Як пісаў Я.Крыер-Ваеўскі, *"воласць трайной экзекуцыяй мучаюць"*[27]. У такіх умовах было немагчыма сабраць падаткі на карысць уладальніка. Але цяжэйшыя часы былі яшчэ наперадзе.

Зімой 1705—1706 гг. у ВКЛ ізноў увайшла шведская армія. Пасля зрыву плану па блакадзе і разгроме расійскага войска пад Гародняй Карл XII вясной 1706 г. правёў паказальную акцыю па рабаванні маёнткаў магнатаў і шляхты, якія займалі антышведскую пазіцыю. Землі К.С.Радзівіла чакаў незайздросны лёс. Шведы цалкам спустошылі Нясвіжскае княства. Гэта не спыніла і размяшчэнне ў самім Нясвіжы казакоў Івана Мазепы. Апошнія сабралі з княства правіянт, а затым былі разбітыя шведамі, якія прымусілі мясцовае насельніцтва сабраць для іх грошы і прадукты. Цалкам быў спалены Свержань, а сам Мір удалося выратаваць толькі праз вялікі выкуп. Усё гэта адбывалася ў час сяўбы, і адміністратарам радзівілаўскіх маёнткаў даводзілася прыкладаць вялікія намаганні, каб засеяць палі. Нясвіжскі адміністратар Ежы Вінцэнты Таўрыловіч пісаў: *"палі ўначы ўпотайкі з вялікай бядой, збіраючы кожнае збожжа па ўсіх пустых фальварках, з ласкі Божай засеяў падчас самага агню"*[28]. Урэшце шведы зышлі, аднак сабраць ураджай спакойна не давялося. У сярэдзіне жніўня ў радзівілаўскія маёнткі сталі наведвацца саксонскія аддзелы Аўгуста II. Мірскі адміністратар Ян Казімір Барташэўскі пісаў: *"Прыйшло на Мірскае графства сасаў коней 1600, а на Карэлічы без Беразаўца коней 500, і ўжо трэці тыдзень стаяць, разлажыўшыся паўсюль на воласці і па зямянах, і загаду рушыць не маюць. Якія паборы па-непрыяцельску бяруць немагчыма апісаць, калі ні ў чым не шкадуючы падданых мучаюць. Што самі хочуць бяруць, збожжа вымалочваюць, жыўнасць тут сабе і ў дарогу, правіянт нарыхтоўваюць, валоў, ялавіц, бараноў б'юць... сялян шмат бяднейшых паўцякала, а багацейшыя цяпер настолькі зрабаваныя, што няма як збіраць дзякла на засеў"*[29].

Наступствам спусташэнняў і праходаў значнай колькасці войскаў стала эпідэмія, якая лютавала ў маёнтках Радзівілаў зімой 1706—1707 гг. Каб ратавацца ад хваробаў, жыхары імкнуліся максімальна ізаляваць свае паселішчы, альбо наогул кідалі дамы і сыходзілі ў лес. Вясной адміністрацыя прыкладала велізарныя намаганні, каб сабраць сялян, якія разбегліся па лясах, і аднавіць гаспадарку. Аднак гэтыя намаганні былі змарнаваныя, бо ўжо ў лютым у рэгіёне пачалі дзейнічаць расійскія войскі, якія цягам усяго 1707 г. выбіралі правіянт з радзівілаўскіх маёнткаў. Асабліва цяжкімі былі вясна і восень. Расійскія жаўнеры дзейнічалі даволі жорстка, імкнучыся сабраць усё наяўнае ў маёнтках і ў сялян збожжа і жывёлу. Е.В.Таўрыловіч пісаў: *"каб маглі, агнём бы ўсё спалілі, жадаючы нічога не пакінуць"*[30]. Такім чынам расійскія атрады рэалізоўвалі Жоўкаўскі план па спусташэнні тэрыторый, якія знаходзіліся на мяркуемым маршруце руху шведскай арміі. Прычынай такіх жорсткіх дзеянняў таксама быў пераход К.С.Радзівіла на шведскі бок пасля падзей 1706 г., пра што хутка даведалася расійскае камандаванне[31]. Змяніўшы лагер, магнат імкнуўся захаваць свае пазіцыі ў Рэчы Паспалітай і зберагчы маёнткі ад празмерных кантрыбуцый на карысць шведаў. Аднак у выніку яны былі дашчэнту зрабаваныя ўжо расійскімі войскамі і іх саюзнікамі. Расійскія жаўнеры і казакі пустошылі Мірскае графст-



*Жаўнеры ламаюць дзверы хаты.*
Малюнак Адрыяна ван дэ Вельдэ. 1669 г.

ва да пачатку вясны 1708 г.: *"тых, хто не мог схавацца, мучылі, білі, пяклі, кожны мусіў пра сваё апошняе дабро распавесці і аддаць"*[32].

Неўзабаве пасля адыходу расійскіх аддзелаў і казакоў на радзівілаўскія маёнткі напалі атрады Рыгора Антонія Агінскага, аднаго з лідараў прарасійскай партыі ў ВКЛ. Іх дзеянні былі не менш жорсткія: *"цяжка выказаць, як людзей мардуюць, рабуюць, адбіраюць усё, што могуць знайсці"*[33]. Некаторыя радзівілаўскія падданыя ішлі ў атрады Р.А.Агінскага, а затым у іх складзе рабавалі сваіх суседзяў. Вярбоўка ў жаўнеры была спосабам выжыць, бо людзі атрымлівалі магчымасць сілай здабываць сабе харчаванне. Важным тут было і памылковае ўяўленне сялян пра вайсковае жыццё, якое фарміравалі эпізадычныя назіранні падчас войнаў ці жаўнерскіх пастояў: тыя рабавалі і адбіралі ўсё патрэбнае, а значыць, самі мусілі не ведаць ніякай нястачы[34].

У хуткім часе аддзелы Р.А.Агінскага былі выбітыя з радзівілаўскіх маёнткаў саюзнікамі шведаў. А за імі неўзабаве прыйшлі і шведскія войскі, якія рушылі на ўсход у пошуках генеральнай бітвы з расійскімі. На Мірскае графства абрынуліся новыя беды: *"Паўсюль па закутках распусцілі* (жаўнераў. — **М.В.**), *месцамі жыта... быдлам сваім, коньмі патравілі. Лясы запальваюць, каб людзі ў іх не хаваліся. Бортныя дрэвы ссякаюць, шукаючы ў іх складзеныя рэчы. Дзе каго зловяць — б'юць, мучаюць, каб вывеў на табар. Пасекі руйнуюць, пчолы з іх павыдзіралі, а менавіта ў Карэлічах і Налібаках. Ужо голад паміж людзей немалы, паміраюць вельмі густа. Сяляне, сабраўшыся, разыходзяцца, бо не маюць з чаго жыць. І шведаў забіваюць. Пад самым Свержанем, як вада сышла, шведы знайшлі ўтопленага шведа з вялікім каменем, прывязаным да шыі"*[35].

У чэрвені шведскія войскі адышлі на ўсход, а мясцовым жыхарам апроч пустак пакінулі хваробы. Асабліва ад іх пакутавалі вёскі тулонскага фальварка, у якіх вымерла больш за 150 чалавек. Неўзабаве ў радзівілаўскія маёнткі ўступілі саюзныя шведам харугвы войскаў Рэчы Паспалітай. У Міры дакладна не ведалі аб далейшых планах шведаў і баяліся, што тыя адступяць назад у Саксонію, а за імі прыйдуць расійскія войскі, якія зноў *"возьмуць у абарот"* радзівілаўскія маёнткі.

У такіх цяжкіх умовах адміністратары радзівілаўскіх маёнткаў, у тым ліку Ян Казімір Барташэўскі, які ў гэты час кіраваў Мірскім графствам, не кідалі сваіх абавязкаў, набывалі ў крэдыт збожжа, па начах збіралі сялян і засейвалі палі. Частку збожжа ўдавалася схаваць у ямах і лясах. Каштоўнасці хавалі і ў шматлікіх ставах каля Міра, пра што добра ведалі шведы, якія спускалі ставы, шукаючы затопленыя рэчы. У такіх экстрэмальных умовах для хавання збожжа і каштоўных рэчаў выкарыстоўваўся і спалены Мірскі замак. Найбольш прыдатнымі для гэтага былі вялікія падзямеллі пад палацам. Прычым магчымасцю схаваць нешта ў спаленай рэзідэнцыі карысталася не толькі радзівілаўская адміністрацыя, але і мірскія мяшчане.

Пасля адыходу шведаў адным з першых будынкаў Я.К.Барташэўскі загадаў аднавіць мураванае гумно ў мірскім фальварку, каб захоўваць збожжа. Характэрна, што яго спальвалі двойчы: спачатку шведы ў 1706 г., а пасля расіяне ў 1708 г. Нягледзячы на ўсе высілкі па аднаўленні гаспадаркі, год быў вельмі цяжкі для сялян, і многія з іх не змаглі засеяць свае палеткі. Заканамерным вынікам гэтага стаў неўраджай.

Вясной 1709 г. сяляне ізноў не змаглі спакойна правесці сяўбу і разбегліся, хаваючыся са сваім набыткам ад зборшчыкаў падаткаў. 27 чэрвеня пад Палтавай армія Карла XII была разбітая і стала зразумела, што ў хуткім часе вернуцца расійскія войскі. Яны з'явіліся ўвосень. Прычым з радзівілаўскіх маёнткаў спачатку выбіралі правіянт для аддзелаў генерала Самуэля Рэнцэля, а пасля для чатырох палкоў пад камандаваннем князя Галіцына, якія ішлі на Вільню. Збор прадуктаў праходзіў на падставе т. зв. Люблінскага тарыфу і быў узгоднены з уладамі Рэчы Паспалітай. Аднак вынішчаным папярэднімі кантрыбуцыямі сялянам і мяшчанам ад гэтага было не лягчэй.

Я.К.Барташэўскі адзначаў: *"Ад тых палкоў апошняя руіна для сялян, паколькі сена, збожжа з вёсак усё пазабіралі, парабавалі, месцамі свіней, авечак, быдла пахваталі і ў мескіх гумнах ніводнага снапа, а ў дамах зерня не пакінулі. З дапамогай дадзеных князем Галіцыным жаўнераў фальваркі абараніў і шкоды значнай у збожжы не меў. Паслаў у Карэлічы гарнізон для абароны двара і збожжа. Сена цяжка захаваць, калі па вёсках і лугах стагі, набягаючы вялікімі атрадамі з вазамі, пазабіралі"*[36].

Як бачна, расійскае камандаванне рабіла спробу надаць збору правіянту і фуражу цывілізаваны характар, аднак цалкам кантраляваць дастаткова вялікае войска не атрымлівалася. Зрэшты Я.К.Барташэўскі лічыў, што расійскія камандуючыя толькі рабілі выгляд, што хочуць спыніць рабункі. Да такіх высноваў ён прыйшоў пасля паездкі ў Слуцк да фельдмарша-

ла Барыса Шарамецева: *"Але руская манера хітрая, бо* (фельдмаршал. — **М.В.**) *наўмысна з'ехаў на паляванне, якім бавіўся некалькі дзён, а потым выдаў загад да генерала Рэнцэля, каб спусташэння не чыніў, калі ўжо дастаткова ва ўсім сабе рабункаў нарабіл"*[37].

На пачатку зімы расійскія войскі ненадоўга пакінулі графства, а Я.К.Барташэўскі сабраў збожжа, якое засталося, і надзейна схаваў, у тым ліку ў падзямеллях замка. Неўзабаве з'явіліся харугвы Рэчы Паспалітай. Тым часам з-за шматлікіх рэквізіцый, змяншэння плошчы пасеваў і неўраджаяў зімой 1709—1710 гг. Мірскае графства апанаваў вялікі голад. Яшчэ больш ускладніла становішча вяртанне расійскіх войскаў у студзені 1710 г., якія сталі ў графстве на зімовыя кватэры.

Да таго ж з пачатку 1710 г. увесь Балтыйскі рэгіён ахапіла жахлівая эпідэмія чумы. Адным з яе ачагоў стаў расійскі лагер пад Рыгай. Разам з жаўнерамі Пятра І, якія сыходзілі на зімовыя кватэры ў ВКЛ, чума ў хуткім часе захлынула беларускія землі, і ў тым ліку радзівілаўскія маёнткі ў Навагрудскім ваяводстве. Аб становішчы Мірскага графства ў красавіку 1710 г. Я.К.Барташэўскі пісаў: *"Хваробы панавалі вельмі вялікія ў гэтыя часы і цяпер тое ж самае. У мястэчку вымерла больш за 100 чалавек, якія ў дамах жывуць. А тутэйшых убогіх жабракоў, якія з розных бакоў прыйшлі, знаходзілі памерлымі з голаду ў печках яўрэйскіх, хрысціянскіх, каля крамаў, каля будынкаў па некалькі дзесяткаў. Іх разам у адной яме закапалі. І цяпер чым далей, тым горш людзі падаюць, тое ж самае па вёсках робіцца. Калі якіх сялян, жанчын, дзяцей знаходзяць памерлымі ў хатах, прызначаным мною* (людзям. — **М.В.**) *загадаў закопваць. Таксама разышлося ў жабрацтве мноства, а якія ў дамах дасюль утрымліваюцца, тыя масквою абабраныя"*[38].

Эпідэмія не сунімалася ўвесь год. Сяляне зачыняліся ў сваіх вёсках, або кідалі іх і сыходзілі ў лес. Тое ж зрабіла і значная частка мяшчан, каб ўратаваць свае жыцці. Аднак суцішыць хвалю захворванняў не ўдавалася. У канцы кастрычніка Я.К.Барташэўскі пісаў наступнае: *"У Міры багацейшыя мяшчане і яўрэі ў розныя бакі ў лясы павыязджалі, але і там смерць не прабачыць, забірае часта... паспольства з убогіх палічыць цяжка, штодня па некалькі дзесяткаў з мястэчка на той свет адыходзіць, а найперш з-за таго, што прага есці прымушае да хватання адкідаў. У падобным стане знаходзяцца вёскі па гасцінцах. Падбіраннем розных рэчаў пазаражаліся, паміж якімі ў цэлым графстве толькі тры дасюль здаровыя... Вёска Радунь, ад Міра ў паўмілі, найбольшая і найлепшая была па прыбытках, цяпер у ёй усе вымерлі, ледзьве ў цяперашні час колькі людзей відаць. Быдла па палях блукае, заняць цяжка"*[39].

Пераадоленню эпідэміі перашкаджалі расійскія войскі, якія стаялі ў Мірскім графстве на кватэрах дзве зімы запар. Жаўнеры разносілі хваробы, а выбіраючы правіянт, даводзілі жыхароў да голаду. Радзівілаўскія адміністратары спрабавалі выпрасіць літасці, але пазіцыя расійскіх вайскоўцаў была жорсткай. Сын генерал-фельдмаршала Б.Шарамецева палкоўнік Міхаіл Шарамецеў, які камандаваў расійскімі войскамі, размешчанымі ў радзівілаўскіх маёнтках, на просьбы Я.К.Барташэўскага зменшыць паборы адказаў наступнае: *"я бацьку не слухаю, але гасудара баюся, каб коні былі тоўстыя і людзі, у гэтых мясцінах мушу браць* (правіянт. — **М.В.**)"[40]. Пры гэтым расійскія камандзіры дзейнічалі асцярожна і не чапалі хворыя вёскі, а збіралі правіянт у паселішчах, якія хваробы закранулі слаба. Што цікава, адзін з магазінаў, у які звозіўся правіянт і фураж, расіяне ўладкавалі ў спаленым Мірскім замку. Там жа шмат рэчаў пахаваў Я.К.Барташэўскі, які баяўся, каб хто-небудзь не вывеў жаўнераў на яго схованкі.

Вясной 1711 г. радзівілаўскія маёнткі наведалі рэвізоры Навагрудскага ваяводства, каб перапісаць колькасць двароў, што засталіся пасля эпідэміі, і вылічыць падаткі. Ніякіх палёгкаў пры іх раскладцы рабіць не меркавалася. Як і раней, правіянт і фураж з радзівілаўскіх маёнткаў выбірала расійскае войска. Вясной у іх для адпачынку спынялася ажно пяць расійскіх палкоў, што ў чарговы раз перашкодзіла правесці сяўбу.

Я.К.Барташэўскі згадваў: *"Ужо над іншыя мінулыя часы* (большае. — **М.В.**) *дзеецца вялікае спусташэнне. Коней, валоў, якіх трохі хавалі сяляне, і тых знайшоўшы забралі ў падводы перавозіць жыта са стаўбцоўскіх спіхлераў у Слуцк. А так і цяпер ані падданых, ані здабытку, і араць, баранаваць для засеву цалкам няма чым. Яшчэ б маглі сабрацца сяляне, калі б не цяперашнія экзекутары, якія што сабе пастанавілі, тое абавязкова выбраць хочуць"*[41].

Тое ж паўтарылася і ўвосень 1711 г. Аднак да пабораў дадаліся яшчэ дзве прыродныя бяды. Першай была саранча, якая знішчыла ўсё збожжа, што ўдалося засеяць і вырасціць, а другой — паморак быдла. У выніку, як пісаў Е.В.Таўрыловіч, у сялян толькі *"голад і слёзы засталіся"*[42].

Інвентарныя апісанні Мірскага графства даюць магчымасць ацаніць маштабы знішчэнняў. Калі да пачатку вайны ў ім пражывала каля 9 тыс. чалавек (3,6 тыс. — у Міры), дык у 1712 г. — усяго 5,5 тыс., з якіх у Міры — 1,3 тыс. Дадзеных па зборы чыншу з Мірскага графства сведчаць аб тым, што найбольш цяжкімі для людзей былі 1709—1711 гг., калі да пабораў на карысць расійскага войска дадалася маштабная эпідэмія чумы. Менавіта ў гэты час смерць забрала жыцці многіх жыхароў графства.

Адзначым, што пасля разгрому шведаў пад Палтавай у 1709 г. баявыя дзеянні на беларускіх землях фактычна не вяліся, а галоўнай прычынай іх заняпаду было размяшчэнне ў ВКЛ значных расійскіх вайсковых злучэнняў, якія працягвалі збіраць з насельніцтва сродкі на сваё ўтрыманне. З лістоў радзівілаўскіх адміністратараў вядома, што з маёнткаў Радзівілаў у Навагрудскім ваяводстве правіянт выбіраўся яшчэ ў 1712 і ў 1715—1718 гг. У большасці выпадкаў ён браўся расійскім войскам, а таксама саксонскімі аддзеламі Аўгуста ІІ і харугвамі ВКЛ. Да гэ-

тых бедаў у 1717 г. дадаўся "*нечуваны неўраджай*". У 1718 г. Е.В.Таўрыловіч пісаў: *"Год за годам галодныя часы і непрыяцельскі маскоўскі ўціск значна па вёсках падданых знішчылі"*[43]. Аб зацяжным эканамічным і дэмаграфічным крызісе сведчыць інвентарнае апісанне Мірскага графства за 1719 г., паводле якога колькасць яго жыхароў засталася на ўзроўні 1712 г.

Падводзячы высновы, адзначым, што адным з галоўных вынікаў Вялікай Паўночнай вайны для Рэчы Паспалітай стала яе далейшае аслабленне, якое стварыла перадумовы для падзелаў дзяржавы ў будучыні. У пачатку XVIII ст. Расія пачала выкарыстоўваць беларускія землі і іх рэсурсы ў сваіх ваенна-палітычных мэтах, а ў канцы стагоддзя яны былі ўжо цалкам уключаныя ў яе склад. Вялікая Паўночная вайна па сваім характары для беларускіх зямель была зусім іншай за папярэднія ваенныя канфлікты. Галоўнай мэтай асноўных варагуючых бакоў, як шведскага, так і расійскага, было збіранне з насельніцтва правіянту і грашовых кантрыбуцый для забеспячэння сваіх армій. Зрэшты, падобным чынам дзейнічалі і вайсковыя аддзелы ВКЛ, якія мелі праблемы з атрыманнем жалавання і фактычна выжывалі за кошт мірнага насельніцтва. Адбіранне ў сялян збожжа і жывёлы прыводзіла да поўнага заняпаду іх гаспадаркі. У выніку шырыўся голад і распаўсюджваліся хваробы, што стала прычынай дэмаграфічнай катастрофы. Такім чынам, беларускія землі сталі ахвярай у супрацьстаянні вялікіх дзяржаў рэгіёна.

---

1 Kossarzecki K. Wielkie Księstwo Litewskie wobec Ukrainy doby Iwana Mazepy. Próba porównania z okresem hetmańtwa Bohdana Chmielnickiego i Iwana Wyhowskiego // Полтавська битва 1709 року в історичній долі України, Pociї, Швеції та інших держав. Харків, 2009. С. 116.

2 Шкваров А. Великая Северная война. Москва, 2015. С. 20.

3 Там жа. С. 21—24.

4 Артеус Г. Карл XII и его армия // Царь Петр и король Карл. Два правителя и их народы. Москва, 1999. С. 158—163.

5 Віцько Дз. Шведскае наступленне 1702 г. у Вялікім Княстве Літоўскім і спроба рэстаўрацыі Сапегаў // Arche. 2011. № 6. С. 8—62.

6 Донских С. В. Армия Великого княжества Литовского во время Северной войны // Северная война 1700—1721 гг. и исторические судьбы Европы. Могилев, 2008. С. 141.

7 Северная война 1700—1721 гг. К 300-летию Полтавской победы. Сборник документов. Т. I (1700—1709 гг.). Москва, 2009. С. 215—219.

8 Волкаў М. Нясвіжскі замак у Вялікай Паўночнай вайне // Вялікае Княства Літоўскае: Права. Вайна. Дыпламатыя. Мінск, 2012. С. 223—226.

9 Kagg L., Lewenhaupt A. Leonhard Kaggs dagbok 1698—1722. Stockholm, 1912. S. 84-85.

10 Волкаў М. Нясвіжскі замак у Вялікай Паўночнай вайне. С. 225—231.

11 Артеус Г. Карл XII и его армия. С. 159.

12 Kamiński A. Piotr I a wojsko koronne w przededniu szwedzkiego uderzenia // Studia i materiały do historii wojskowości. T. 15. 1969. S. 47—52.

13 Шкваров А. Великая Северная война. С. 65.

14 Там жа. С. 72.

15 Там жа. С. 67—70.

16 Агееў А. Р. Магілёўская ратуша і падзеі Паўночнай вайны // Северная война 1700—1721 гг. и исторические судьбы Европы. Могилев, 2008. С. 4—10; Пашкевіч У. І. Адлюстраванне падзей Паўночнай вайны ў актавых кнігах Аршанскага гродскага суда // Северная война 1700—1721 гг. и исторические судьбы Европы. Могилев, 2008. С. 215-216; Шкваров А. Великая Северная война. С. 71.

17 Шкваров А. Великая Северная война. С. 71—75.

18 Артеус Г. Карл XII и его армия. С. 173.

19 Порцыя (пол. porcja) — адзінка налічэння платы для жаўнераў Рэчы Паспалітай.

20 Ciesielski T. Armia koronna w czasach Augusta III. Warszawa, 2009. S. 8, 19—47.

21 Ciesielski T. Militarny aspekt unii personalnej Rzeczypospolitej z Saksonią na tle unii realnej polsko-litewskiej // Праблемы інтэграцыі і інкарпарацыі ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы ў перыяд ранняга Новага часу. Мінск, 2010. С. 395.

22 Аляхновіч Р. Уладанні роду Іллінічаў у ВКЛ і іх лёс // Род Іллінічаў у Вялікім Княстве Літоўскім у XV—XVI стагоддзях. Мір, 2015. С. 187—195.

23 Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 694, воп. 2, спр. 4466, 10725; Воп. 14, спр. 64; Ф. 1774, воп. 1, спр. 139; Archiwum Główne Akt Dawnych (далей — AGAD). Archiwum Radziwiłłów (далей — AR). Dz. V, nr. 17664; Dz. XXIII, t. 92, pl. 7; Dz. XXV, nr. 2443.1. Пры падліках колькасці насельніцтва была выкарыстана методыка Ю.Можы.

24 AGAD. AR. Dz. V, nr. 402, 9022, 9133, 16163, 17664.

25 Толстой П. Путешествие стольника П.А.Толстого по Европе (1697—1699). Москва, 1992. С. 20.

26 AGAD. AR. Dz. V, nr. 9022. S. 9—11.

27 Там жа. Nr. 17664, s. 162.

28 Там жа. Nr. 16163, s. 16—19.

29 Там жа. Nr. 402, s. 12—15.

30 Там жа. Nr. 16163, s. 38-39.

31 Письма и бумаги императора Петра Великого. Т. IV. Примечания. Санкт-Петербург, 1900. С. 960-961.

32 AGAD. AR. Dz. V, nr. 402, s. 60—63.

33 Там жа. Nr. 16163, s. 57—59.

34 Woźnica K. Famine and poverty in the army during the reign of the House of Vasain the light of reports and diaries // Historia i Świat. 2016. Nr 5. P. 185—186.

35 AGAD. AR. Dz. V, nr. 402, s. 92—95.

36 Там жа. Nr. 402/II, s. 62—64.

37 Там жа. S. 72—75.

38 Там жа. S. 116—119.

39 Там жа. S. 144—147, 157, 159—161.

40 Там жа. S. 144—147, 157.

41 Там жа. S. 185—188.

42 AGAD. AR. Dz. V, nr. 16163/IV, s. 94—96.

43 Там жа. Nr. 16163/III, s. 65—67.

# *Беларусь у Вялікай Паўночнай вайне (1700—1721 гг.)*

*(да матэрыялу Міколы Волкава)*




*План Гародні, складзены невядомым шведскім картографам у пачатку XVIII ст.*
Пазней быў памылкова датаваны 1655 г.




План бітвы пад Лясной 9 кастрычніка 1708 г.




План сутычак шведскай і расійскай армій у раёне рэчкі Белая Натапа 10 верасня 1708 г.

8 (217)
жнівень
2017 год

Выдаецца са студзеня 1993 г.

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

*Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1221 ад 14 студзеня 2013 г.*

Выходзіць 12 разоў у год (з ліпеня 2003 г.)

## НАВУКОВА-ТЭАРЭТЫЧНЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ЧАСОПІС

**Заснавальнікі:**

**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Пачатковая школа", дзяржаўная навуковая ўстанова "Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі", Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**

**Галоўны рэдактар Максім Навумавіч Гальпяровіч**

**Рэдакцыйная калегія:**

**Канстанцін Бандарэнка, Сымон Барыс, Пётр Брыгадзін, Рыгор Васілевіч, Вячаслаў Даніловіч, Валерый Жук, Віктар Іўчанкаў, Аляксандр Каваленя, Міхаіл Касцюк, Веньямін Космач, Уладзімір Кошалеў, Васіль Кушнер, Надзея Кушнер, Рыгор Лазько, Аляксандр Лакотка, Аляксей Літвін, Анатоль Люты, Вольга Ляўко, Ігар Марзалюк, Наталля Матусевіч, Аляксандр Радзькоў, Аркадзь Русецкі, Аляксандр Смолік, Сяргей Ходзін, Мечыслаў Часноўскі, Алег Яноўскі, Эдмунд Ярмусік.**

**Рэдакцыйная рада:**

**Уладзімір Адамушка, Марыя Бяспалая, Аляксандр Вабішчэвіч, Надзея Ганушчанка, Уладзімір Гілеп, Аляксандр Груша, Аляксандр Гужалоўскі, Таісія Доўнар, Дзяніс Дук, Ларыса Жэрка, Аляксандр Каханоўскі, Аляксандр Корзюк, Аляксандр Кушнярэвіч, Вячаслаў Лазіцкі, Святлана Марозава, Леанід Мартынаў, Сяргей Новікаў, Алег Слука, Валерый Талкачоў, Людміла Трыгорлава, Уладзімір Тугай, Віктар Фядосік, Неаніла Цыганок, Анатоль Шаркоў.**

**Рэдакцыя:**

Намеснік галоўнага рэдактара — **Наталля Матусевіч**, рэдактар аддзела — **Вітаўт Чаропка**, мастацкае афармленне — **Уладзімір Малахаў**, вёрстка — **Надзея Пяткоўская**, карэктура — **Людміла Шчэрба.**

## ЗМЕСТ

**ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ**

Алесь Суша, Галіна Кірэева — **Першая беларуская друкаваная кніга** — 3

**ВАЕННАЯ ГІСТОРЫЯ**

Мікола Волкаў — **Беларусь у Вялікай Паўночнай вайне (1700–1721 гг.)** — 8

**ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ**

Вольга Корсак — **Археалагічны накірунак у дзейнасці статыстычных камітэтаў беларускіх губерняў** — 19

## ЗМЕСТ


**ІМЁНЫ ВЯДОМЫЯ І НЕВЯДОМЫЯ**

**Віктар Фядосік** — **Рымлянін Понцій Пілат: таямніцы біяграфіі** 31

**МЕТОДЫКА. ВОПЫТ**

**Учитель истории – это профессионал с добрым сердцем и высокой культурой** 40

**Эмилия Хазанович** — **Использование активных приемов обучения для развития познавательной активности учащихся на уроках истории** 41

**Виктор Жук** — **Повседневная жизнь человека** *(VI класс)* 50

**Наталля Ганчарэнка** — **Сусветны эканамічны крызіс і краіны Заходняй Еўропы і ЗША ў 1929—1933 гг.** *(X клас)* 57

**Надежда Кушнер** — **Западная Европа и США в XIX — начале XX века: обобщающий кроссворд для подготовки к олимпиаде** 64

**Таццяна Монід** — **Францыск Скарына — светач зямлі беларускай!** *(пазакласнае выхаваўчае мерапрыемства)* 71

**Бібліяграфія метадычных распрацовак урокаў па сусветнай гісторыі, надрукаваных у "Беларускім гістарычным часопісе" ў 2008 — першай палове 2017 г.** 75

**Содержание** 79

**Summary** 80



*У адпаведнасці з загадам Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 4 ліпеня 2005 г. № 101 (у рэдакцыі загада Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 2 лютага 2011 г. № 26) "Беларускі гістарычны часопіс" уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па гістарычных і юрыдычных навуках, а таксама па мастацтвазнаўстве і культуралогіі.*

*Адрас рэдакцыі: 220007, г. Мінск, вул. Фабрыцыуса, 5, кабінет 211.*
*Тэлефон: 8(017)395-79-11. http://www.p-shkola.by; e-mail: bhc.redaktor@tut.by.*
*РУП "Выдавецтва "Пачатковая школа".*
*Падпісана да друку 21.08.2017 г.*
*Выхад у свет 28.08.2017 г. Афсетны друк.*
*Фармат 60х841/8.*
*Ум. друк. арк. 9,3. Ул.-выд. арк. 11,4.*
*Наклад 460 асобнікаў. Зак. 567.*
*Таварыства з абмежаванай адказнасцю "ЮСТМАЖ".*
*ЛП № 02330/250 ад 27.03.2014 г.*
*220103, г. Мінск, вул. Каліноўскага, д. 6, Г 4/К, пак. 201.*


*Да ведама аўтараў!*
*За дакладнасць прыведзеных у артыкулах фактаў і цытат адказнасць нясуць аўтары. Рэдакцыя можа друкаваць матэрыялы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтараў. Навуковыя артыкулы прымаюцца да разгляду з рэкамендацыяй кафедры (аддзела) вучэбнай або навуковай установы. Рэцэнзаванне арганізоўвае рэдакцыя. Да разгляду прымаюцца рукапісы аб'ёмам не больш за 20 старонак (кегль 14, праз 1,5 інтэрвала) у двух экзэмплярах (абавязкова на электронных носьбітах). Неабходна ў допісах паведамляць свае прозвішча, імя і імя па бацьку, кароткія звесткі пра сябе, пашпартныя даныя (абавязкова асабісты нумар), адрас, тэлефон. Рукапісы не вяртаюцца.*


© "Беларускі гістарычны часопіс", 2017.